Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 7 (648). Wilnia, Niadziela 9 Lutaha 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Прычыны нашай абновы

Хочам тут сказаць колькі слоў аб прычынах абновы БХД і перайменаваньні яе на БНА. Аб прычынах далейшых і аб усіх гаварыць тут ня будзем. Маем наўвеце прычыны толькі некаторыя й галоўныя, а да таго спэцыфічна прычыны нашы беларускія, што вынікаюць з сучасных варункаў палітычнага й соцыяльнага палажэньня беларускага народу.

Першай прычынай нашай абновы ёсьць імкненьне вызваліць нашу беларускую палітычную думку з чужацкіх рэлігійна-палітычных цянётаў. Выясьнім гэта коратка. Бел. Хрысьціянская Дэмакрацыя, як з натуры сваей іменна хрысьціянская, прынамсі маральна дае магчымасьць умешваньня ў яе справы духоўнай уладзе. Тымчасам, як да ўсякай беларускай народнай і грамадзкай працы адносіцца ў нас духоўная польская каталіцкая й расейская праваслаўная ўлада, — усім добра ведама. Асабліва яркім гэтага прыкладам зьяўляецца выступленьне процiў нас польскага арцыбіскупа Ялбжыкоўскага ў 1928 г. Шукаць-жа сужыцьця й згоды з гэтай уладай, — значыла-б зьвесьці БХД да якога рэлігійнага брацтва, значыла-б дайсьці да абсурду і скасаваць нашу дасюлешнюю 20-цілетнюю беларускую народна-грамадзкую й палітычную працу. Узноў-жа праводзіць працу ў кірунку незалежна-хрысьціянскім, значыла-б далей драбіць беларускую душу, якая й так раздроблена, і працаваць на шкоду беларускага народу. Вось жа прыйшлося пашукаць выхаду. Гэткім выхадам ёсьць наша абнова, гэткім выхадам ёсьць Бел. Нар. Аб'еднаньне, як агульна-беларуская, палітычная арганізацыя, якая мае вольную руку, між іншым, як у абароне беларускага народу ад тых крыўдаў, што выцякаюць з выкарыстваньня процiў нас фашызмам і капіталізмам царквы й касьцёлу, так і ад тых, што вынікаюць з нішчэньня рэлігіі ваюючым атэізмам, які ломіць у чалавека сумленьне і забівае ягоныя маральныя вартасьці.

Другой прычынай нашай абновы ёсьць факт, што ў беларусаў, на жаль, бадай няма ідэолёгічна-беларускіх палітычных арганізацыяў, калі ня лічыць народных соцыялістаў, беларуская ідэолёгія якіх фактычна знаходзіцца яшчэ ў зародку. Іншыя-ж групы й групкі — гэта ўсё нешта кон'юнктуральнае, ор'ентацыйнае, сэзоновае, а часам ідэолёгічна й сусім чужое, небеларускае. Дайшло нават да таго, што такі Астроўскі й Луцкевіч і іх адгэрэнты (на шчасьце нямногія!), — што выявілася на іх грамадзкім судзе з дня 14.XI.35 і пасьля суду ў прэсе, — бралі грошы з польскіх «конфідэнцыяльных» (сакрэтных) крыніц і, пасьля выяўленьня гэтага, выступалі ў абароне маральнасьці гэтага факту і яго карыснасьці беларускай справе! Што за беларуская ідэолёгія можа быць у гэткай «палітыцы», кожнаму ясна.

Вось-жа БХД, маючы ўсё гэта наўвеце, мусіла абнавіцца, каб расшыраючы свае партыйныя рамкі, пад сьцягам БНА, даць магчымасьць працы над беларускай палітычнай і соцыяльнай ідэолёгіяй усім тым беларусам, якіх лёс беларускага народу сапраўды цікавіць і якія шукаюць дарог для яго поўнага адраджэньня й вызваленьня.

Трэцяй урэшце прычынай нашай абновы зьяўляецца факт расьцярушаньня сучаснага беларускага народнага жыцьця і патрэба яго аб'яднаньня. Што БНА мае гэта на воку, відаць з яго назовы, відаць і са зьместу праграмы, у якой, праўда, дарэмна будзе шукаць сабе жыру ўсякая вузка-партыйная дэмагогія і адсталая рэакцыя, а ў якой кожны беларус добрай волі знойдзе сабе апору для беларускай палітычнай і соцыяльнай працы.

Урэшце яшчэ скажам колькі слоў на заканчэньне. Нас крытыкуюць, хваляць і ганяць, прысылаюць свае ўвагі й пажаданьні. Дужа з гэтага цешымся і далей просім беларускае грамадзянства мець над нашай працай сваё крытычнае вока. Запэўняем, што з пладоў творчай крытыкі ахвотна скарыстаем і, прыдзе час, праграму нашу калі трэба будзе ўзноў абновім і адпаведна паправім.

Пакульшто зрабілі мы тое, што зрабіць маглі і мусілі для дабра беларускага народу ў пару ашалелага фашызму й дагараючага капіталізму.

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы! — Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

24036

На фронт барацьбы з анальфабэтызмам

Анальфабэтызм залівае нашую зах. беларускую краіну бяз спыну. Пагроза затопай анальфабэтызму зусім канкрэтная.

Глядзець бязрадна на гэтае зьявішча ня можна. Трэба яго спыняць.

Нашыя беларускія культурна-асьветныя арганізацыі, як Бел. Інстытут Гасп. і Культуры, а так-жа ТБШ і іншыя ўстановы, паводле магчымасьці, вядуць барацьбу з анальфабэтызмам. Але гэта барацьба павінна ахапіць усе дзялянкі, гдзе ён праяўляецца. Мы тут хочам зьвярнуць увагу на пагрозу анальфабэтызму паваротнага — з прычыны нявуцтва дзяцей.

Мы стаім на становішчы, што школьніцтва для беларускіх дзяцей павінна быць беларускае; беларускіх дзяцей павінны вучыць пабеларуску вучыцялі беларусы; беларускія дзеці павінны мець мейсца ў школе.

Нашыя дамаганьні ў гэтай справе дасюль не здаволены. Але гэта ня значыць, што мы ня маем права і абавязку далей дамагацца. Дзеля гэтага мала „стаяць на становішчы,“ але трэба дамагацца дзейна. Мы мусім падаць дэклярацыі з дамаганьнем навучаньня нашых беларускіх дзяцей пабеларуску, — каб яны ня былі анальфабэтамі, каб яны ня былі няграматнымі; мы мусім падаць дэкляарацыі за беларускую школу на кошт казны.

Уважаем, што Беларусы здабудуцца на грамадзкую ініцыятыву ў барацьбе з анальфабэтызмам.

Уважаем так-жа, што Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і Таварыства Беларускае Школы ўпершую чаргу пакліканы да таго, каб гэтую справу паставіць ва ўсю шырыню.

Дык чакаем!

п—к.

Biełaruskija skaŭty

Siańnia, u časie nia tolki mataryjalnaha, ale taksama i duchowaha kryzysu, treba źwiarnuć asabliwuju ŭwahu na skaŭtynh.

Skaŭtynh isnuje i raźwiwajecca, jak mižnarodnaja arhanizacyja, pierad usim moładzi. Załažyŭ jaje anhielski hienerał Baden-Powell. Pieršym i najhałaŭniejšym zadańniem skaŭckaj arhanizacyi jošć maralnaje ŭzhadawańnie moładzi. Ideolohija skaŭtynhu siańnia ŭžo źjaŭlajecca ahulna-wiedamaj. Najwyšejšyja ideały jaho wyražajucca ŭ kličy „Boh i Baćkaŭščyna“. Značeńnie skaŭckaj arhanizacyi, asabliwa dla niedziaržaŭnych narodaŭ, wialikaje. Biełarusy da hetaj pary majuć tolki adnu družynu swaich skaŭtaŭ im. Fr Bahušewiča ŭ Wilni pry Biełaruskaj Filii Dziaržaŭnaj Himnazii im. J. Sławackaha. Družyna heta dziakujučy swaim enerhičnym družynowym, raniej K. Paŭlu, a ciapier A. Brazoŭskamu, raźwiwajecca pamysna. Biełaruskaja wučnioŭskaja moładź achwotna ŭstupaje ŭ rady swajej skaŭckaj arhanizacyi, dzie ćwičycca i fizyčna i duchowa.

* * *

2 lutaha sioleta ŭ pamieškańni Wil. Biel. Himnazii adbyŭsia arhanizacyjny schod Hurtka Pryjacielaŭ Biełaruskich Skaŭtaŭ. Prysutnych było 20 asob. Staršynioj schodu byŭ ks. dr. St. Hlakoŭski, sekratarom Č. Najdziuk. Schod adčyniŭ hram. M. Ancukiewič, apiakun Wil. Družyny Bieł. Skaŭtaŭ im Fr. Bahušewiča, jaki ŭ swajej pramowie wykazaŭ, miž inšym, kanieśnuju patrebu zaśnawańnia Hurtka Pryjacielaŭ Bieł. Skaŭtaŭ. Na załažeńnie takoha Hurtka ŭsie prysutnyja zhadzilisia i padali siabroŭskija deklaracyi.

Paśla adbylisia wybary wykanaŭčych orhanaŭ Hurtka. Na staršyniu wybrany ks. dr. St. Hlakoŭski, na siabroŭ uradu: paručn. Kazłoŭski Uł., jak sekratar, i hram. Najdziuk Č., jak skarbnik, a hram. hram. Mankiewič Uł., Kruk K. i Wiernikoŭski, jak siabry Rewizyjnaj Kamisii.

Zadańniem Hurtka Pryjacielaŭ Bieł. Skaŭtaŭ maje być materyjalnaje padtrymańnie i maralnaja apieka nad biełaruskimi skaŭtami.

Siabroŭ HPBS abawiazuje miž inšym miesiačnaja siabroŭskaja składka—pa 50 hr. płaciać starejšyja, a 25 hr. moładź dy 1 zał. — adnarazowa, upisnych.

Pažadana, kab bieł. hramadzianstwa, razumiejučy wialikaje maralna-ŭzhadawaŭčaje značeńnie skaŭtynhu dla bieł. moładzi, achwotna padtrymała, chto čym tolki moža, hetuju nowuju hramadzkuju apalityčnuju arhanizacyju.

Małady pryjaciel skaŭtaŭ.

Mahčymaść niamiecka-sawieckaj wajny

Tyja hazety, jakija majuć bliskuju suwiaź z uradami roznych dziaržaŭ, nadta časta pišuć, što Eŭropa staić prad mahčymaściaj wajny miž Niamieččynaj i Sawietami. Sawieckija hazety pišučy ab zachodnie-eŭrapejskich imperyjalistyčnych praciŭnikach SSRR, pakazwajuć tak-ža na Niamieččynu, jakaja maje namier wystupić aružna praciŭ Sawietaŭ.

Hetak padazrawać Niamieččynu sawieckija hazety majuć pawažnyja padstawy, asabliwa padazrawać ciapierašni hitleraŭski ŭ Niamieččynie ŭrad.

Eŭrapejskija palityki zusim pawažna ličacca z mahčymaściaj wajny Niamieččyny z Sawietami. Wiedajem, što Francyja ŭ sajuzie z Sawietami, a Polšč z Niamieččynaj. Francyja wyrazna staić praciŭ Niamieččyny, a Polšč nia choča stajać pa staranie praciŭnikaŭ Niamieččyny. Niamieččyna wiadzie nastupajučuju palityku praciŭ Litwy, jakaja ležyć na darozie z Niamieččyny ŭ SSRR. U wypadku napadu Niamieččyny na Litwu, Sawiety buduć zmušany wystupić u abaronie litoŭskaj dziaržawy nia tolki dziela abarony słabiejšaha ad silniejšaha, ale ŭ abaronie swaich-ža ŭłasnych intaresaŭ.

Mnoha jošć faktaŭ, jakija kidajuć padazreńnie, što Niamieččyna pad pawadyrstwam Hitlera rašycca padniać wajnu.

Niamieckija wajennyja zbrajeńni pakazwajuć, što niamieckija hienerały sapraŭdy hatowiacca da wialikaj wajny.

Б. Н. А.

Абнаўленьне БХД зацікавіла шырока беларускія сялянскія масы. У справе абновы вясковыя дзеячы многа пісалі ў нашую рэдакцыю карэспандэнцыяў і многа прыслалі ў Прэзыдыюм Ц К. заўваг і праектаў абнаўленьня праграмы. Пасьля апублікаваньня ўложанай праграмы, як праекту, былі так-жа крытычныя пісьмы і прапазыцыі дапаўненьня праекту праграмы. Па абнаўленьні БХД нашая рэдакцыя атрымлівае, між іншымі, пісьмы з вёскі гэткага зьместу:

У Рэдакцыю „Беларуская Крыніца“ Вільня, Завальная вул. 1—1.

Мы ніжэй падпісаныя сяляне вёскі N, Маладэчанскага павету, гэтым заяўляем, што з праграмай БНА згаджаемся.

Язэп К—ль, Пав. Кі—ль, Пётр Рам—скі, Ів. Кіс..., Вез. Бе—кі, Міх. Бе-цкі, Іг. Ів—іч, Пётр Д—скі, Пётр А—ль, Ал. Р—кі, Ант. Ча—скі, Н. Бер—цкі, Меч. Б—ка.

АД РЭДАКЦЫІ: З ведамых прычын падаём прозьвішчы ў скарочаньні.

Супольная дзейнасьць польскіх арганізацыяў у нашым Краю.

Надовячы польскае „T-wa Rozwoju Ziem Wschodnich“ праз сваю дэлегацыю падала міністру ўнутраных спраў у Варшаве праект сваей дзейнасьці ў наступным годзе.

Гэты праект зварачвае асаблівую ўвагу на патрэбу злучэньня дзейнасьці розных польскіх грамадзкіх арганізацыяў у нашым Краю.

Словам, трэба спадзявацца паўстаньня адзінага фронту польскіх арганізацыяў у нашым Краю, мэта якіх, у сэнсе нацыянальным, аднолькавая.

Пры гэтым трэба зьвярнуць, яшчэ раз увагу на разьбіўніцкую работу ў беларускім народна-вызваленчым руху, якую праводзяць „хатнія“ палітыкі — безаглядныя крытыкі, робячы гэта, быццам, для дабра беларускага народу. Гэтым беларускім „хатнім“ дзеячом радзім шырэй аглянуцца навокал і адтуль навучыцца, як трэба змагацца цяпер за беларускую справу.

U litoŭcaŭ

Nowyja abšyry ziamli pryhodnaj dla ŭprawy. Jak štohod, tak i ŭ minułym 1935 h. u Litwie ŭłady starajucca pawialičyć abšyry pryhodnaj dla ŭprawy ziamli, asušajučy bałota, rehulujučy reki i tamu pad.. U minułym hodzie na hetyja mety byli praznačany 2 milijony litaŭ. Praz usio leta pry meljoracyjnaj rabocie pracawała da 5 tysiač rabotnikaŭ. Usiaho za minuły hod atkrytymi rawami asušana 33,260 ha ziamli i zdrenažawana (założany truby) 1238 ha. Aprača hetaha, sami sialanie, pry pomačy technikaŭ, prysyłanych na dziaržaŭny košt, wykapali 610 klm. rawoŭ i asušyli 14,000 ha ziamli. Ad 1920 da 1935 h. za dziaržaŭnyja hrošy asušana 340.954 ha ziamli. Hetak rupicca litoŭskaja ŭłada ab swaich sialanach.

Skolki ŭ Litwie padzielena dwaroŭ. Jak wiedama, u Litwie šmat dwaroŭ pierajšlo na ŭłasnaść dziaržawy, jakaja ziemli ich padzialiła pamiž žaŭnieraŭ achwotnikaŭ i tak pamiž biezziamielnych i małaziamielnych sialan. I tak ad 1919 h. da 1936 u Litwie padzielena 5,513 dwaroŭ, z jakich 783.226 ha abšyru ziamli stwowrana 75.256 chutaroŭ.

Aprača padzielu dwaroŭ, prawodziłasia tak-ža chutaryzacyja siołaŭ. Ad 1919 da 1936 h. padzielena na chutary 5.056 siołaŭ, z jakich utworana 115,946 chutaroŭ.

U hetym hodzie budzie prawodzicca chutaryzacyja siołaŭ i padziel dwaroŭ, što jašče astalisia.

* * *

Spyniajuć dziejnaść litoŭskich praświetnych tawarystwaŭ. Jak pišuć polskija i litoŭskija hazety, u niekatorych pawietach wilenskaha wajawodztwa polskija administracyjnyja ŭłady spynili dziejnaść niekatorych addziełaŭ t-wa św. Kazimiera i Rytasa. Stałasia heta z tej pryčyny, što byccam henyja tawarystwy pracawali niazhodna z prawam.

Kantrola dziejnaści Litoŭskaha Nacyjanalnaha Kamitetu ŭ Wilni. Hazety pawiedamlajuć („Słowo“ z dnia 4.II.36), što wilenskaje starastwa prawodzić kantrolu dziejnaści Lit. Nac. K-tu ŭ Wilni, prahladajučy pratakoły i inš. Robić-ža heta starastwa, uważajučy heny Kamitet za „stowažyszenie“.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу. Выпісвайце найстарэйшую беларусую газэту „Беларускую Крыніцу!“

Japonska-sawieckija bai na Dalokim Uschodzie

Tass padaje: Z Chabaroŭska infarmujuć:— 30 studnia sioł. sawieckaja pahraničnaja straža spatkała za 3 kilametry ad hranicy na sawieckaj terytoryi 4 ch mandžuraŭ i japoncaŭ. Kali ich chacieła zatrymać, jany pačali stralać. Adnačasna źjawilisia i pačali stralać jašče dźwie azbrojenyja hrupy — 30 asob japoncaŭ i mandžurcaŭ. Kali pryjšła sawieckaja padmoha 25 asob, pačaŭsia boj. Tady na sawieckuju terytoryju pryjšli nowyja addzieły japonskaha i mandžurskaha wojska. U wyniku baraćby, nawat na štyki i na šabli, japonska-mandžurskija addzieły adstupili za mandžurskuju hranicu.

U hetaj sprawie sawiecki ŭrad padaŭ japonskamu ŭradu swoj pratest.

Słowam, na Dalokim Uschodzie pachnie poracham.

Chatniaja wajna ŭ Kitaju

U Kitaju ŭžo daŭno wiadziecca chatniaja wajna. U siarednim centralnym Kitaju, stalicaj jakoha jość Nankin, ułada znachodzicca ŭ rukach buržuaznaha ŭradu na čale z Čan-Kaj-Šekam, a paŭdzionnym Kitajem z stalicaj Kantonam uładajuć kitajskija kamunisty.

U apošnija časy, kali nankinski ŭrad zusim pačaŭ paddawacca ŭpływam Japonii, sympatyi kitajcaŭ bolš pachililisia ŭ bok kamunistyčnaha ŭradu ŭ Kantonie. Dziela hetaha pačalisia i na froncie wajny pieramohi kamunistyčnaj armii. Eŭrapejskija hazety padajuć, što 300-tysiačnaja kamunistyčnaja armija źbiła wojska nankinskaha ŭradu i adabrała celuju prawincyju Kwej Gaje. Hetuju woś chatniuju wajnu ŭ Kitaju wykarystywaje Japonija dziela ŭkrapleńnia swaich upływaŭ u Azii. Japonija, pad widam abarony Kitaju ad kamunizmu i zmušajučy da zhody z japoncami nankinski ŭrad, zajmaje swaim wojskam adnu prawincyju za druhoj u Paŭnočnym Kitaju i tworyć tam swaje „mandžuryi“ — byccam niezaležnyja ad Japonii aŭtanomnyja respubliki.

Aŭstryja — Litwa, Łatwija i Estonija

Wajenny nastroj sučasnaj Niamieččyny mocna niepakoić usiu Eŭropu. Wiedamaje imknieńnie Niamieččyny na eŭrapejski ŭschod najpierš pahražaje samastojnaści Aŭstryi z adnaho boku, a z druhoha boku niezaležnaści Litwy, Łatwii i Estonii.

Dziela hetaha eŭrapejskija palityki, što stajać suproć imperyjalistyčnych imknieńniaŭ Niamieččyny, dbajuć ab zabiaśpiečańni samastojnaści Aŭstryi, a tak-ža ab niezaležnaści Litwy Łatwii i Estonii.

Nadowiačy ŭ hetaj sprawie niekatoryja zacikaŭlenyja dyplamaty — pradstaŭniki niekatorych eŭrapejskich dziaržaŭ,—naradžalisia z nowym francuskim ministram zahraničnych spraŭ Flandinam, jaki trymajecca dasiulešniaha stanowišča Francyi — nienarušeńnia dziaržaŭnych hranic.

Biełaruski Instytut Haspadarki i Kultury Vilenski Addzieł Vilnia, Zavalnaja 1—1.

Pračytaj, sam pryjdzi i druhich pryviadzi.

P A W I E D A M L E Ń N I E

U niadzielu dnia 16-ha lutaha sioł. u zali Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury pry Zawalnaj wul. 1—1 budzie pračytana nawukowa-papularnaja publičnaja lekcyja na temu:

„Pačatki chryścijanstwa i piśmienstwa na Biełarusi“.

a) Relihija Biełarusaŭ pierad pryniaćciem chryścijanstwa. b) Upływy na Biełaruś zachodniaha i ŭschodniaha chryścijanstwa. c) Pryniaćcie chryścijanstwa ŭ uschodnim (hreckim) abradzie. d) Pačatak sławianskaha piśmienstwa (hłaholica i kirylica). e) Pomniki biełaruskaha piśmienstwa z Połackaha peryjadu.

Lekcyju čytacimie Ks. W. Hadleŭski.

Pačatak roŭna a hadzinie 17-aj. Uchod wolny i biasplatny. Zala ciopłaja. Wiešałka biaspłatnaja.

Urad Wilenskaha Addziełu BIHiK.

Dr. Stanisłaŭ Hrynkiewič

Aświeta

8)

(Ab Narodnym Uniwersytecie i inšych sposabach aświetnaje pracy).

13. Narodny teatr.

(Praciah).

Adnačasna teatralnaść maje inšyja žaroły ŭ čaławieku. Kožny čaławiek maje swaje dumki, nastroi, kožny imniecca pa miery mahčymaści padzialicca z imi sa swaim asiarodziščam. Wykazywajučy swaje, jašče mo' nia zusim ujaŭlenyja dumki, čaławiek pačynaje lepš bačyć ich u sabie. Tolki woś nia ŭsieńka možna wykazać słowam. Inšym razam až niešta ściskaje pad sercam, a nia wiedaješ, što jano tam sapraŭdy, niečaha čaławiek choča, za niečym tužyć, ab niečym latucić. Heta wiedaje kožny, adzin bolš, druhi mienš, adnak heta swomaść nadta charakternaja ŭ ludziej. Maładyja majuć „nastroi“ bolš jarka padčyrknuty, u inšych da poznaha wieku astajucca jany wielmi mocnymi i žywymi.

Henyja woś nastroi ŭjaŭlajucca najlepš u wieršach, muzycy, skokach, adnym słowam u abraznym pradstaŭleńni. Jasna, forma hetaha pradstaŭleńnia budzie roznaja, zaležna ad roŭnia kultury, ad bahaćcia formaŭ, jakimi karystajecca i jakimi władaje dadzienaje zhurtawańnie ludziej. Asnaŭny adnak charaktar astajecca ŭsiudy toj samy, i nastolki nam nakidajecca, što nawat časta zusim na dalokaje i adležnaściu hieahrafičnaju i ŭmowami žyćcia samoha haworyć da nas abrazami kožnamu blizkimi i zrazumiełymi.

Zaŭsiody, dumajučy na hetu temu, nakidajecca mnie na pamiać abrazok z žyćcia malajskaje wioski. Niekalki hadoŭ tamu nazad adzin z niamieckich cyrkaŭ wandroŭnych (cyrk miž inšym suświetnaje sławy „Hagenbecka“ waziŭ z saboju horbu henych, jak my kažam, „dzikunoŭ,“ napałowu apranutych, zaŭsiody źmierzšych, nia hledziačy na haračuju letniuju paru. Henyja ludzi pamiž roznych swaich štukaŭ pakazwali pierad hladzielniaju swaje abyčai wiaskowyja ŭ formie byccam karahodaŭ, pieśniaŭ supolnych hramadzkich. I kali-b zapluščyć wočy, kab nia bačyć čužych twaraŭ, ci kab prynamsia apranuć henych ludziej u wyabražeńni ŭ našyja šeryja świtki, dyk była-b absalutnaja iluzija biełaruskaje wioski, z jaje sumnymi matywami chaŭturnymi ci na't žniŭnymi.

Dyk teatr heta źjawišča niezaležnaje ad ekanamičnych mamentaŭ, niezaležnaje ad zmahańniaŭ socyjalnych, niezaležnaje ad złybiadaŭ hramadzkich i prywatnych, heta ŭ peŭnym sensie źjawišča ŭniwersalnaje, prysutnaje na kožnym punkcie kuli ziamnoje. Każu niezaležnaje źjawišča, majučy na ŭwiecie asnaŭnyja rysy teatru, bo ŭ praciahu wiakoŭ teatr apranaje roznyja formy, jon bahaciejšy ci biadniejšy, jon pakidaje pa sabie bolšyja ci mienšyja śledamki ŭ sensie ŭzhadawańnia, bo ž teatr uzhadoŭwaje, što zrazumieć wielmi lohka, heta ŭsieńka zaležna ad taho, jakija ahulnyja kanjunktury, jakija mahčymaści hrašowyja, jakimi prablemami žywie čaławieckaja hramada i h. d.

Jość peryjady zaniapadu teatru, chacia nie prapadaje jon nikoli; jon patreba dušy, jak chleb patreba cieła. Pobač z chlebam buduć roznajakija strawy, ad pary da pary taja ci inšaja strawa mo' wielmi smašnaja budzie na našym stale, adnak da chleba zaŭsiody my wierniemsia.

Peryjadam zaniapadu teatru, prajawaŭ teatralnych, byccam na't instynktu teatralnaści, byli niadaŭnija ŭ nas hady, kali čužoje ŭ nas duchawienstwa, asabliwa katelickaje, u swajom zmahańni (što za paradoks!) z „bredniuškami“ jak heta jany kazali, pačali wyhaniać z chataŭ staryja abyčai, pieśni, abrady.

Niekatoryja siańniašnija wołaści našaje zachodniaje terytoryi niaščasnyja, zusim „hłuchija“ kutki, dzie sumna i mlaŭka placiecca dzień rabočy, dzie narod pačynaje byccam stohnučy dzień i kančaje jaho biaz nijakaje radaści. Jany nia majuć formy pryhožaje dziela swaich pieražywańniaŭ, a nia majučy formy wonkawaje, nia majuć taje hłybini, ščyraści i taje prostaje radasnaści hetak karysnaje dziela ahulnaha ŭzdojmu, badziorych adnosinaŭ da žyćciowaha toku.

Teatr, pieśnia, muzyka — usieńka stulna złučana z saboju i adno z adnaho wychodzić, dapaŭniaje adno adnoje i daje toje kaliwa ščaścia i radaści, da jakoje hetak pražna imkniecca žywaja adzinka.

Hetak razumiejučy wialikaje značeńnie teatru i inšych prajawaŭ mastackaści ŭ žyćci adzinki i hramady, lohka ŭjawim sabie, jakija mohuć być našyja adnosiny da ich.

My zabywajemsia lišnie časta ab *uzhadawaŭčaj* roli teatru. Našyja adnosiny da teatru wielmi prostyja. Narod lubić pradstaŭleńni, narod lubić paśmiajacca, dyk treba jaho krychu paciešyć, dać mahčymaść paśmiajacca. I na žal wielmi časta mienš źwiartajecca uwahi na toje, z čaho narod hety śmiajecca, ci jość sapraŭdy z čaho śmiajacca ŭ našych pjesach narodnych.

Pakinu adnak krytyku našaha teatralnaha repertuaru, chacia tema henaja nakidwajecca, kab ab joj pahawaryć. Nie ŭwachodziačy ŭ bolš dakładnuju acenku repertuaru, treba skazać, što jon słaby i kolkaściu i roŭniem. Da siańniašniaha dnia nia majem swaje reprezentacyjnaje pjesy, jakaja-b u aryhinalnaj formie zakranała žyćcio z aspektam bolš ci mienš wiečnym, jakaja-b u žywoj formie mieła paciahiwajučuju i pryciahiwajučuju siłu.

Adsutnaść sceny wyklikaje niedachop repertuaru, niedachop sceny nie daje mahčymaści raźwiwacca scenie... i z henaha kruhu nia wyleźci anijak. Źjawišča henaje pakazywaje miž inšym na toje, što ŭ nas niešta papsawałasia ŭ tom najbolš naturalnym žyćci, kali kožnaje bolš žywoje źjawišča nakidywałasia adzincy ci hramadzie i apranałasia ŭ sceničnuju formu. Žyćcio razminułasia sa scenaju

Roznyja wiestki

Ukraincy ab Biełarusach. U Lwowie ukrainskaje T-wa „Łuh“ wielmi časta ładzić na roznyja temy referaty. Nadawiačy tam pračytaŭ wiedamy ukrainski pišmieńnik, pryjaciel Biełarusaŭ, red. A. Kurdydyk referat ab Biełarusach pad Polščaj.

Prelehent, jaki mieŭ mahčymaść paznać biełaruski adradženski wyzwalenčy ruch u Zach. Biełarusi na miejscy, abrazowa pradstawiŭ słuchačom sučasnaje pałažeńnie i arhanizawanuju pracu Biełarusaŭ pad Polščaj.

Pa referacie red. Kurdydyka, dyr. I. Juščyšyn prypomniŭ prysutnym ab pozytyŭnym ŭčaści Biełarusaŭ u budaŭnictwie ukrainskaj dziaržawy ŭ Kijawie ŭ 1918 h.

U kancy dyryhient choru „Łuhu“ zajawiŭ, što nawučyć swoj chor piajać biełaruskija pieśni i nastupnym razam zademonstruje słuchačom našuju narodnuju melodyju.

Z POLŠČY

Siamiejnyja niełady. Aficyjalna arhanizacyja BB užo nia isnuje, ale faktyčna „prožondowy obuz“ jošče i jon padtrymliwaje sučasny režym u Polščy. Hety „obuz“ składajecca z niekalkich hrupaŭ, jakija miž saboju u pahladach na sprawy hramadzkija roźniacca. Najhałaŭniejšyja hrupy hetaha „obozu“ takija: „hrupa pałkoŭnikaŭ,“ „hrupa konserwatystaŭ,“ „hrupa pramysloŭcaŭ,“ „hrupa lawicy,“ „hrupa UNDO, Żydoŭ i Niemcaŭ.“

Da apošnich wybaraŭ u Sojm i Senat, usia ŭłada ŭ dziaržawie była ŭ rukach „hrupy pałkoŭnikaŭ,“ na čale jakoj stajaŭ pałk. Sławek. Paśla sojmawych wybaraŭ, jakija wyjawili, što palityka „hrupy pałkoŭnikaŭ“ prajhrała, — na čale ŭradu stanuŭ Kościałkoŭski, jaki naležyć da pierachodnaj hrupy, što častkowa prychilajecca da „hrupy lawicy.“

Pałkoŭnickaja hrupa prawodziła palityku h. zw. „silnaj ruki,“ jakaja nasielnictwu ničoha dobraha nie dawała; nasielnictwa pačało stawić adpor, jaki prakanaŭ i ŭpływowyja dziejniki polskaj palityki z inšych hrupaŭ hetaha „abozu,“ što palitycy „hrupy pałkoŭnikaŭ“ treba zrabić kaniec.

Pad naporam hramadzkaj apinii „hrupa lawicy“ pačała stawić damahańni ŭ kirunku častkowaj demokratyzacyi. Nawat „hrupa konserwatystaŭ“ pačała damahacca, kab urad pajšoŭ nasustreč hramadzkaj apinii.

Takim čynam ciapier u „prožondowym obozie“ stwaryłasia „siamiejnaja“ apazycyja da „hrupy pałkoŭnikaŭ,“ i hetaja apazycyja ŭžo zajawiła: —...„baraćba z nami budzie nia łohkaja.“

Poŭbiezrabotnyja. Apošnimi časami hazety zwaročwajuć uwahu na ŭzrost h.zw.poŭbiezrabotnych. Prawilnaja zaŭwaha, što ab stanie pracy na padstawie kolkaści biezrabotnych haworyć niełha. Treba brać pad uwahu, kolki ludziej pracuje stała, a kolki nia stała — pa dwa try dni ŭ tydzień, a to i ŭ miesiac. Bo poruč biezrabotnych, što zarejestrawanyja, jość masy rabotnikaŭ, jakija pracujuć tolki pa dwa dni ŭ tydzień i materjalna jany zusim blizkija da biezrabotnych. Źjawišča poŭbiezrabotnych zasłuhoŭwaje na ŭwahu i dzieła taho, što armija hetkich ludziej ŭsciaž raście. Ad 1928 h. da žniŭnia 1935 h. lik poŭbiezrabotnych u Polščy ŭzros u pramyśle z 68 tysiač da 154 tysiač asob. U 1928 h. kožny wośmy rabotnik byŭ zatrudnieny častkowa, u 1931 h. užo kožny čaćwierty, a ŭ 1935 h. užo kožny treci rabotnik zatrudnieny tolki častkowa.

Na asabliwuju ŭwahu zasłuhoŭwaje wialikaja armija poŭbiezrabotnych, što zatrudnienyja tolki pa 1—2 dni ŭ tydzień. U 1928 h. hetakich rabotnikaŭ było 4,3 proc. usich pramysłowych rabotnikaŭ, a ciapier jany stanowiać 10 proc.

Wialikaja armija poŭbiezrabotnych— heta niamienš hroznaje źjawišča, jak i armija biezrabotnych.

Za skasawańnie łahieru adasabnieńnia ŭ Berezie Kartuskaj. Na pasiedžańni Sojmu 24 studnia pasoł S. Baran ad imia Ukrainskaj Parlamentarnaj Reprezentacyi (UNDO) padaŭ prapazycyju skasawańnia łahieru adasabnieńnia, jaki ciapier isnuje ŭ Berezie-Kartuskaj.

Zabastoŭka. U Waršawie nadowiačy strejkawali tramwajščyki, hetak pratestujučy suproć h. zw. padwojnaha apadatkawańnia pensijaŭ. U sieradu 5 h. m. strejkawali drukary, damahajučysia zaklučeńnia kolektyŭnaj umowy i ŭstanaŭleńnia nowych warunkaŭ pracy.

Z ZAHRANICY

Z wajennaha frontu ŭ Afrycy. Italijanska-abisynskaja wajna razharajecca. Užo nie zaŭsiody ŭdajecca italijancam žbiwać słaba azbrojenych abisyncaŭ. Apošnimi časami abisyncy pačali nastupać na italijancaŭ i dawoli ŭdačna. Hetymi dniami abisyncy akružyli m. Makalle, žwiarnuli ŭ druhi bok rusło raki, jakaja pracioknje praz hetaje miesta, i hetak italijancaŭ pazbawili wady ŭ Makalle. Dzieła hetaha spadziajucca, što italijancy Makalle nia ŭtrymajuć.

Musolini strašyć Eŭropu wajnoj. Wiedama, što mnohija dziaržawy hatowy zastasawać suproć Italii najwastrejšyja sankcyi dzieła spynieńnia italijanskaha napadu na Abisyniju. Italijanski dyktatar Musolini strašyć świet, što hetkija sankcyi wykličuć u Eŭropie wajnu. Słowam, nahłaść fašyzmu pierachodzić usie hranicy pryzwaitaści.

D-r Amende ab Ukrainie. Sekratar Kanhresu Nacyjanalnych Mienšaściaŭ u Żenewie d-r Ewald Amende prabywaje ciapier u Amerycy, dzie ŭ hutarcy z niekatorymi ukrainskimi dziejačami, miž inšym, skazaŭ nastupnaje:—nacyjanalnaja świedamaść na Ukrainie niazwyčajna ŭzrasła i niama pryčyny, kab bačyć niepamysnaść ukrainskaj budučyni. Ratunak, adnak, Ukrainie musić pryjści tolki ad jaje samoj, a nie z nadziei na wonkawuju pomač. Usie wiestki ab wajennym pachodzie zachodnich dziaržaŭ na Ukrainu jošč chiba tolki pažadańniem adzinak, a nie jakojści sapraŭdnaj akcyi ŭradaŭ susiednich dziaržaŭ.

Wybary ŭ Hrecyi. Dnia 26 studnia adbylisia ŭ Hrecyi parlamanckija wybary, jakija pakazali słabaść u narodzie manarchistaŭ i što manarchistyčnyja ŭrady biez padtrymańnia respublikancaŭ nia ŭtrymajucca. Manarchisty zdabyli tolki na 2 pasły bolš ad respublikancaŭ. Hety fakt pakazwaje, što niadaŭnaje ahulna-narodnaje „zdawaleńnie“ ŭ Hrecyi z pryčyny ŭstanaŭleńnia manarchii było nie sapraŭdnaje, — a padroblenaje. Ciapier u Hrecyi silnaj partyjaj jošč partyja Wenizelosa, taja partyja, jakaja letaś padymała bunt prociŭ dyktatury manarchistaŭ, a da ŭłady prychodziać tyja ludzi, katorych tady za bunt mahli sudzić na karu śmierci. Słowam, burnaja i, jak zaŭsiody, niespakojnaja Hrecyja.

San Marino ŭ rukach fašystaŭ. Wiedamaja maleńkaja respublika ŭ Italii, San Marino, apynułasia ŭ rukach fašystaŭ. Hetak končyłasia słaŭnaja wola respubliki, što dawała prypynišča nie adnamu palityčnamu biehlacu. Jana była kaliś na toje i zasnawana, kab dać prypynišča palityčnym biehlacam.

U Niamieččynie prašledujuć katalikoŭ. Z Berlina pawiedamlajuć: — hitleroŭski sud zasudziŭ ks. Bitnera na 13 miesiacaŭ turmy byccam za niedakładnaje wyjaŭleńnie dachodu; prawodzicca sudowaje śledstwa suproć žanočaha klaštaru Alžbietak, jakomu zakidajuć niezakonnaje žbirańnie hrošaj.

Kamunistyčnaja prapahanda ŭ Madziaršcynie. Nadowiačy wykryli ŭ Madziaršcynie wialikuju kamunistyčnuju arhanizacyju, jakaja wielmi šyroka wiała prapahandu.

Z KRAJU.

Zabastoŭka rybakoŭ na woziehrach Narač i Miadzieł. Paśla letašnich burnych wystupleńniaŭ biełaruskich rybałowaŭ nad Naračam, sprawa supiarečnaści prawa z interesami rybałowaŭ akančalna nia wyrašana. Ciapier z hetaj pryčyny pačali strejkawać rybałowy Naračanskaha i Miadzialskaha waziornaŭ, damahajučysia palohki ŭ rybałoŭstwie.

Zabili sekwestratara. Nadowiačy kala Jasianoŭski, Biełastockaha paw., zabity sekwestratar Ul. Dudyński, a tak-ža zabity i furman, sielanin K. Laskoŭski, jaki wioz sekwestratara.

Ababili sołtysa. U Horadniu ŭ špital byŭ prywieziemy žbity i niaprytomny sołtys z Indury, Jan Kurjan. Kali Kurjana ačucili ŭ špitali, jon zajawiŭ, što jaho žbili sialanie za toje, što jon, sołtys, padawaŭ uładam wiestki ab majemaści hetych sialan dzieła wyznačeńnia im padatku.

Zatopa Paleśsia. Biezmaroznaja i daždžliwaja zima šmat pryčyniaje škody, asabliwa na Paleśsi. Sialanie nia mohuć wywieźci siena z bałota i nia majuć čym karmić skaciny. Ciapier raźlilisia paleskija rečki i šyroka zatapili łuhi, na jakich stajać stahi siena. Sialanie łodkami wywoziać z bałota siena, jakoje jašče nie zaniata ŭ wiarchoch stahoŭ wadoj.

Z WILNI

Kanfiskata. Administracyjnaja ŭłada skanfiskawała Nr 13 hazety „Poprostu“ i Nr. 3 časapisu „Przegląd Wileński“.

Naša pošta

Mach. Atrymali, dziakujem. Budziem karystać. Hazetu i premiju wysyłajem. Nie zabywajcie nas.

Kackiel. Karespandencyju atrymali, dziakujem. Skarystajem. Naležnyja Wam knižki wyšlem.

Kołbijski. Karespandencyju Wašuju papprawiŭšy nadrukujem. Pišycie ab ahulnych sprawach, a nie ab prywatnym žyćci.

Arač. Atrymali. Dziakujem. Skarystajem. Papraŭlajem, kab nia wychodziła hazeta biełabokaj.

„Čytač“. Z Wašaha piśma widać, što Wy nadta mała čytajecie hazety. U hazetu treba pisać ab sprawach pawažnych, jakija majuć ahulnaje značeńnie. Wašaja karespandencyja pajšła ŭ košyk. Pišycie pawažniej.

Kurkul. Wašu karespandencyju papprawiŭšy drukujem. Čytajcie hazety i knižki, dyk budziecie wiedać, ab čym pisać i jak pisać.

A. Bužanski. Waš artykuł ab litaraturnaj tworčaści ŭ Zach. Biełarusi pieradali ŭ časapis „Калосьсе“ i dawiedwajemsia, što budzie źmieščany ŭ 1 (5) knižcy hetaha časapisu. — Red. „Kałośsia“ choča być z Wami ŭ kantakcie.

ŭ nas i dahetul nia mohuć jany z saboju sustrecca. Heta miž inšym adna z zaminaŭ pry bujniejšym razwoi teatru na wioscy.

Adradžeńnie narodaŭ sławianskich i niesławianskich wiedaje wializarnyja wartaści teatru. Prykład ich wielmi jarka pakazwaje na praŭdu, ab jakoj ja tolki što kazaŭ. Kožny z henych narodaŭ šukaŭ i znajšoŭ swaju formu idučy ŭ „narod,“ kab jaho wučyć, kab pašyryć jahonyja haryzonty, kab dać jamu pražyć niekalki časinaŭ u wialikim i wysokim nastroi. Temy byli najčaściej historyčnyja, temy mitałahičnyja, temy, jakija ŭ formie najpraściejšaj imknulisia pakazać, što isnujuć praŭdy wiečna žywyja. I nastrojem z takich scenak žyli ludzi prostyja i ždali niečaha lepšaha. Heta była sapraŭdnaja strawa dzieła dušy.

Ab jakim teatry my haworym? Ci heta teatr realny, ci heta teatr našaje mahčymaści, ci tolki teatr fantazii? Zaŭsiody treba padumać i dać sabie adkaz tych realnych mahčymaściaŭ, na ŭłońni jakich tčecca žyćcio.

Siańnia my wiedajem dwa asnaŭnyja typy teatru ahulna biaručy. Teatr *amatarski* i teatr *adumyslovćaŭ*, teatr prafesyjanalny. Adradžeńnie biełaruskaje wiedaje canu teatru. Ab zasłuhach našaha teatru samatužnaha zaŭsiody nam treba pomnić. Šmat dzie jon, nia hledziačy na swaje skromnyja mahčymaści, byŭ tym pieršym šturškom, jaki skranuŭ świadomaść i pakłaŭ fundamenty świadomych adnosinaŭ da siabie i swajho narodu.

Teatr na terytoryi siańniašniaje Zachodniaje Biełarusi byŭ amatarskim. Bujny, jak kažuć, razwoj teatru stałaha pa druhoj staranie sučasnaje ryskaje hranicy pakazwaje na toje, što patreba jaho wielmi wialikaja. Adnak my siańnia nia možam nat łatuciec ab stałaj trupie ci niekalki trupach u paasobnych punktach našaje nacyjanalnaje terytoryi. Mahčymy byŭ-by ŭ nas teatr wandroŭny, sprobu naładžańnia jakoha my nahladali woś niedaŭna tamu nazad. Nažal našaja halita nie dała doŭha jamu pažyć. Astajecca tolki wykłučna swoj skromny amatarski teatr. Tolki treba, kab byŭ jon krychu inšy, čymsia najčaściej nahladajem my siańnia.

Razumieju wielmi dobra, što sceptyki horka ŭ henym miescy pačnuć kiwać hałowami. Dzie i što kazać siańnia ab niejkim bolš idealnym teatry, kali siańnia prostaje „pradstaŭleńnie“—heta *bierojstwa* tych,što ŭzialisia za henuju dumku. Kožnaje pradstaŭleńnie—heta amal nie martyrolohija niekalki adzinak u sensie pracy nad padrychtoŭkaju da starany mastackaje, sa starany techničnaje. Henyja padarožy da ŭładaŭ administracyjnych, henyja drobnyja hrošy na stempli, amal nia z celaje wioski pahałoŭna. I martyrolohija da taho jašče kančajecca tym, što z usich kłopataŭ ničoha na pahlad nia wychodzić, dzieła taho, što... pamiaść čeńnie nie padychodzić, ci jašče niešta, i kaniec zdajecca ŭsich zachodaŭ.

Adnak heta nie pawinna spyniać našych natuhaŭ. Sprawa ŭ teatry lišnie wialikaja, kab z natuhaŭ ničoha nie astałosia. Nie! Astajecca toje, što pierażyli siabry dadzienaha zhurtawańnia ŭ suwiazi z ładžańniem pradstaŭleńnia. Jany pracujučy nad pjesaju wyraśli praz heny čas, jany majuć za sabou peŭny dośled z umiectwa ŭwajści ŭ dušu ludziej z pjesy. Świet u ich užo pašyryŭsia, jany nia tyja, jakimi byli niekalki tydniaŭ tamu nazad.

Kab adnak henaja padrychtawaŭčaja praca nie prapała darma, treba kab padychod da supolnaje siabroŭskaje pracy byŭ inšy, čymsia heta najčaściej jano bywaje dahetul. Teatr—kab byŭ nia tolki dzieła tych hladzielnikaŭ, teatr kab byŭ dzieła samych artystaŭ. Nieświedama karystajuć jany z jaho zaŭsiody. Tolki treba kab pajawilisia jašče adnosiny dziejna świadomyja. Treba kab u henym narodnym teatry pakazalisia nowyja cennaści. Sprawa nie kančajecca ŭ teatry na tym, kab nawučycca bolšaje ci mienšaje kolkaści wieršaŭ čužoha tekstu napamiać. Sprawa ŭ tym, kab teatr byŭ mahčymaściu wykazać swoj źmiest mastacki, swoj pahlad, kab jon byŭ zdabyčaju adnosinaŭ da pytańniaŭ žyćciowych, da minuŭščyny. Sprawa ŭ tym, kab teatr byŭ teatram asiarodzišča, kab jon byŭ złučany ŭmowami supolnaha žyćcia dadzienaje hramady. Sprawa ŭ tym, kab na płoščy teatry ludzi pačali dumać, kab pradstaŭleńnie było prynukaju da myśleńnia. Hetki teatr nie patrabuje nat hatowych tekstaŭ pjesaŭ, jon čerpaje z taho, što kruhom baččyca. Pjesa, jejny tekst budzie ihrać rolu wiechaŭ, jakimi možna kirawacca, jakija možna ŭ kožnym mamencie adkinuć, kali sam pačuješ praŭdu inšuju, čymsia aŭtar jaje znašoŭ. Heta nia budzie absalutnaja improwizacyja. Usieńka budzie abhaworana kolektyŭna z siabrami teatralnaha zhurtawańnia.

Na pieršy pahlad zdajecca, što hetki teatr trudniejšy, čymsia toj, da jakoha my prywykli, dzie dawoli tolki nawučycca tekstu, kab byccam ihrać. Adnak nia treba wialikaje praktyki, kab skazać, što hetki teatr na doŭha nie zdawolić mastackaha pačućcia hladzielnikaŭ. Jany zachopliwajucca bačučy adzin, dwa, dy na't šmat razoŭ hetkuju pastanoŭku teatralnuju, dzieła taho, što bačać u joj asabliwyja cennaści, dzieła taho, što čujuć sa sceny *rodnaje słowa*. Adnak teatr taki lišnie mała pamahaje ŭ razwoi ichniaje dušy i chutka prychodzić para zniechwočańnia da takoje sceny.

My ŭ našym biełaruskim žyćci nie nahladali takoha kryzysu, bo časta ahułam nia majem mahčymaści bačyć nijakaha teatru. Adnak reźmiarkoŭwajučy pracu, nia treba nam zabywacca ab takoj niebiaśpiecy, i padumajma, kab naš budučy teatr na wioscy, naš sapraŭdny teatr narodny, daŭ nam usieńka, što ad jaho možam uziać.

I znoŭ heny imprawizacyjny teatr nia budzie ani hetki strašny ani trudny. Hlańma na dziaciej, jakija ni čytać ni pisać nia ŭmiejuć, a jak jany choraša ŭmiejuć adyhrać roznyja sytuacyi žyćciowyja, jak jany ŭmiejuć wykazać swaje łatuceńni, pahlady na tak ci inšyja prajawy z taho, što baćcy

Piśmy z wioski

Ab žyćci ŭ našaj staroncy.

S i o m k i, Świancianskaha paw. Našaja wioska nie małaja — maje 45 chataŭ. Žychary našaj wioski amal usie biełarusy — kataliki, nacyjanalna dawoli świedamyja. Da 1914 hodu ŭ nas biełaruskaj hazety nia widać było, prychodzili tolki polskija časapisy. Sialanie polskimi hazetami mała cikawiacca, bo słaba ich razumiejuć. Ciapier mnohija wypisywajuć „Biełaruskuju Krynicu" i achwotna jaje ŭsie čytajuć, asabliwa achwotna čytaje biełaruskuju hazetu našaja moładź.

Jość u našaj wakolicy škoła, ale polskaja. Wučycielka hetaj škoły adnačasna jość staršynioj „Pažarnaj straży" i instruktarkaj „Stšelca" i „Krakusa." Moładź našaja ŭ hetyja polskija arhanizacyi nia horniecca. Bywajuć u nas i pradstaŭleńni, ale taksama polskija, dyk našaja moładź i tudy nieachwotna zahladaje.

U wioscy Dubnikach 14.XI.1935 h. było biełaruskaje pradstaŭleńnie, dyk tady było zyšoŭšysia z usiej wakolicy „mora" narodu. Byli staryja, byli i małyja, byli mužčyny, byli i žančyny.

P a t.

Dzikaja „kultura."

A p i t a, Lidzkaha paw. Naša „šlachockaja" wakolica dawoli wialikaja. Iažyć jana pa dwoch bakach rečki tej samaj nazowy. Ludzi ŭ nas ličacca častkowa šlachtaj i wyjšaŭšy ŭ druhuju wiosku ci ŭ miastečka starajucca hawaryć „popolskiemu", a hetym samym uważajuć siabie „kulturnymi" i „lepšymi" za „mužykoŭ." Z taje pryčyny jość tut mnoha roznych dziwakoŭ „šlachockaje kultury" i jość dewotki, jakija nia lubiać biełaruskaje hazety.

Moładź naša nia maje nijakaje arhanizacyi — ni biełaruskaj ni polskaj, i kulturnymi sprawami nia cikawicca, a prawodzić swaju „kulturu." Časta ładziać tut wiečarynki, na jakich pjuć harełku, chto skolki zmoža. Pjuć za astatniuju załatoŭku, choć u chacie niama zašto kupić kilo soli, — a paśla bjucca pamiž saboj, jak dzikary. U takich abstawinach šyracca bojki, ihra ŭ karty, ašukanstwy i roznyja prastupki.

Wiečaram 17 studnia h. hodu W. S. pajšoŭšy da zaručanaj susiedki, udawy, zarezaŭ jaje dziewiara, katory niaprychilna adnosiŭsia da jaho. U prošłym hodzie pamior u wilenskim wastrozie J. S., muž hetaj udawy; jon prabywaŭ tam za zabojstwa susieda.

Darahaja moładź, apamiatajsia i zawaročywaj z taje darohi. Prypomni tolki, jak marna prapaŭ J. S. za swaje dzikija pastupki, prypomni, jak zamknuli wolu W. S. Pierastańcie pić wodku i kidajcie drennyja nałohi. Wy pryšli na świet, jak ludzi, nie na toje, kab być hańbaj narodu ci kab wašu wolu zamykali ŭ łancuhi. Zmahajciesia jak možacie z ciemnatoj, wypisywajcie swaje biełaruskija hazety, knižki i čytajcie ich. Arhanizujcie biblijateku i praświačajciesia, a tady paprawicie swoj byt i dačakajecie lepšaha zaŭtra.

Š l a c h c i c a s y n.

Wiestki ŭ hazetu.

(Z Niaświskaha paw.).

Čytajučy „Biełaruskuju Krynicu" spatykajem šmat karespandencyjaŭ, u jakich wiaskowyja karespandenty apisywajuć ab žyćci sialan wa ŭsim našym Kraju — Zach. Biełarusi. Wot i ja pastanawiŭ napisać u rodnuju hazetu „Bieł. Krynicu" ab žyćci sialan u našym kutočku. Nasampierš napišu ab swajej wioscy Jeśkawičach. Našaja wioska maje 29 wałok ziamli; wałoka ŭ nas maje 12 dziesiancinaŭ. Apračа hetaha jość 90 dzies. ziamli kuplenaj ad kniazia Radziwiła, za katoruju žychary našaj wioski wypłacili daŭno i katoraj bolš 90 hadoŭ uładajuć. U 1923 h. uprawa dwaroŭ kn. Radziwiła zažadała, kab našyja sialanie padpisali umowy na kuplu hetaj ziamli pa 114 pudoŭ žyta za dziesiacinu. Mnohija zhadzilisia. Chto mieŭ hrošy, płaciŭ adrazu, a chto nia mieŭ, płaciŭ procant, — užo zapłacili pa 300—400 zł. Tolki biedniaki zapłacić nijak nia mohuć. Sialanie šukali praŭdy — pasyłali delehataŭ u roznyja ŭradowyja instytucyi, nawat i ŭ Waršawu, chacieli dawiedacca, ci sapraŭdy treba płacić za hetuju ziamlu Radziwiłu i ci jana ŭłasnaść sialan i za jaje płacić nia treba. Delehaty wiarnulisia i zajawili, što treba płacić.

Płaciać i płačuć sialanie. Ničoha nie paradziš, biez ziamielki prapaści možna. Moža chto wiedaje, kudy z hetaj sprawaj źwiarnucca, — prašu napisać našym sialanam praz „Biełaruskuju Krynicu."

Daŭniej, kali našyja pradziedy mieli celyja wałoki ziamli, tady musili chadzić u dwor adbywać pryhon, a ciapier henyja wałoki padzieleny na małyja častki, jakija nijak nia mohuć prakarmić pražywajučaj na hetaj častačcy wałoki siamji i ludzi taksama musiać iści ŭ dwor i tam pracawać doŭhi letni dzień za 60 hrašoŭ. Pry hetym treba płacić padatki, a kali ŭ paru nie zapłaciš, to sekwestratar dabawić 1 zł. 50 hr. za „upomnieńnie" i košty zyskiwańnia. Našyja ludzi majuć šmat „zalehłych" padatkaŭ.

Da nas nadta nieakuratna prychodziać biełaruskija hazety. Da pošty ad našaj wioski 8 kilometraŭ. Hazety dasyłajuć praz wołaść. Bywaje, što prychodzić tolki paławina hazety.

Z hetaj sprawaj treba macniej pastupić. Treba damahacca na pošcie, kab adtul trebawali akuratnaha pierasyłańnia praz wołaść hazet u wioski.

D a h l a d č y k.

Damahajmasia biełaruskaj škoły!

(Z Świancianskaha paw.).

Mnoha haworać i šmat pišuć ab patrebie nawučańnia dziaciej u rodnaj mowie. Rodnaj mowaj u mnohich miajscoch Świancianskaha pawietu jość mowa biełaruskaja. Dziela hetaha nam patrebnaja biełaruskaja škoła. Tymčasam u nas usiudy, dzie ŭsie haworać tolki pabiełarusku, a dzieci jnakš i nie razumiejuć, pačatkowyja škoły ŭsie polskija, u jakich biełaruskich dziaciej wučać polskija wučycieli papolsku. Pry hetym treba adznačyć, što našaja moładź polonizacyi nie paddajecca i škoła na jaje nia robić nijakaha ŭpływu i ŭrešcie z škoły moładź wychodzić amal niahramatnaja.

Ahułam kažučy, polskaja škoła ŭ biełaruskich wioskach zdała ekzamin, jakim pakazwaje, što dla biełaruskich dziaciej patrebnaja škoła biełaruskaja.

Dyk damahajmasia nawučańnia ŭ škołach našych dziaciej pabiełarusku.

A r a č.

Wiestka z našaj wioski.

Ł u k a š e w i č y, Świancianskaha paw. U nas jość užo świedamyja biełarusy, jakija lubiać čytać biełaruskija hazety.

U našuju wiosku pieršy raz pryjšła biełaruskaja hazeta — heta „Biełaruskaja Krynica," i tolki sioleta paśla Nowaha Hodu. Ciapier źbirajucca sialanie z usiej wioski i čytajuć swaju rodnuju hazetu.

K u r k u l.

Янка Музыкант.

Н а в а с ё л к і, Нясьвіскага пав. Сынок нашага Александра Салаўя, Янка, мае 7 гадоў і ўжо добра йграе на скрыпцы. Ён грае многія танцы і песьні, якія чуў з грамафону, або з іншых інструмантаў. Александар Салавей вельмі бедны чалавек і вучыць малога Янку ня мае ніякае магчымасьці.

Магчыма гэта зорка беларускай музыкі..., але яна можа загаснуць у вясковай глушы сярод гора і бяды.

С.

Чытайце і пашырайце адзіны беларускі гаспадарскі часапіс „САМАПОМАЧ"! Пробныя нумары высылаюцца бясплатна. Адрас: Red. „Samapomač", Wilnia — Wilno, Połackaja Nr. 9—4.

Da čytačoŭ „Biełaruskaj Krynicy"

HRAMADZIANIE!

„BIEŁARUSKAJA KRYNICA" wydajecca koštam składak i achwiaraŭ jaje čytačoŭ. **Składka: na hod 4 zł., na paŭhodu 2 zł., na try miesiacy 1 zł.**

Wydawiectwa „BIEŁ. KRYNICA" dziela pašyreńnia i pahłybleńnia ŭ biełaruskich narodnych masach nacyjanalnaj, socyjalnaj i palityčnaj świedamaści raspaŭsiudžwaje biełaruskaje drukawanaje słowa — hazety, knižki, brašury i žurnały.

Wydawiectwa „BIEŁ. KRYNICY" dla swaich čytačoŭ wyznačyła premiju ŭ formie knižak na 1936 hod.

Chto pryšle da 1 sakawika 1936 h. składku na cely hod — 4 zł. toj atrymaje p r e m i j u z 4-ch knižak:

1) «КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ» — У. Ігнатоўскі,

2) «РОДНЫ КРАЙ» — чытанка для дзяцей Л. Гарэцкая,

3) СЬМЕРЦЬ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА» — М. Машара

i 4) „KAZKA AB RYBAKU I RYBCY" — W. A.

Hrošy treba słać na adras „BIEŁ. KRYNICA", Wilno, Zawalnaja 1—1.

UWAHA. Stałymsupracoŭnikam i karespandentam Wydawiectwa hazetu pasyłaje biazpłatna, a tak-ža na žadańnie wyšle i wyšejaznačanuju premiju.

Wydawiectwa „Biełaruskaje Krynicy".

čać ichnija wočy. Ich nichto nia wučyŭ, nichto im nia kazaŭ, što takoje teatr, — heta prosta ŭnutranaja ŭ ich patreba wykazać pierad druhimi i pierad saboju niešta, što ŭ dadzieny mament ich cikawić.

Kožny z nas abo sam adyhrywaŭ abo bačyŭ, jak adyhrywajucca hetkija dziciačyja „teatry", i tutaka zaruka, što sapraŭdy ŭ kožnaj hramadzie ležać wializarnyja mahčymaści, jakija treba tolki wykarystać, nie bajacca zrabić pieršaje sproby.

Knižka, lekcyja buduć strawaju dziela adzinak świedamych kulturna i z peŭnaju praktykaju ŭ henaj halinie žyćcia. Ludziam, jakija nia majuć prywyčki da knižki, hazety, teatr budzie niečym niezastupimym. Teatr, mastactwa ahułam, majuć pierawahu nad inšymi mahčymaściami kulturnaha dziejańnia dziela taho, što jany ŭ pieršuju čarhu źwiartajucca da pačućcia, wyabražeńnia ŭžo nie adzinak, a bolšych hramadaŭ, masaŭ ludziej, uwodziačy ich hetkim čynam u sferu nacyjanalnych pieražywańniaŭ i adnačasna dajučy ŭsim hlanuć šyrej z boku śmiachotnaha ci pawažnaha na charastwo ŭ žyćci ci ahułam na prablemy, jakija razyhrywajucca nawokał nas.

I woś swoj samastojny teatr, jak ništo bolš, źjaŭlajecca krynicaju tych wielmi roznych padświedamych imknieńniaŭ dušy čaławieckaje, jakaja patrabuje tolki maleńkaha šturšku, kab rastulić swaje listočki, maŭlaŭ taja kraska, što pačuŭšy na sabie koski sonka, zaraz pachilajecca da ich i pražna ŭsmoktywaje toje raskošnaje bahaćcie, što pływie na ich zdalok.

Biaručy praktyčna, kali niama napraktykawanych na miescy ludziej, treba karystacca pjesami nadrukawanymi, kab nabrać peŭnaha nawytaru sceničnaha. Adnak kab zaŭsiody taja adzinka, jakaja najbolš pačuje ŭ sabie ducha teatralnaści i jakaja budzie nam za režysera, — značycca plany i pahlady jakoha čaławieka budziem prymać za normu ŭ takich sprawach, npr. jak razumieć skaz, jakaja asnaŭnaja linija pjesy, jak wyhawarywać peŭnaje słowa, jak razstawić abstanoŭku chatniuju na scenie, jak i z jakim naciskam hawaryć tyja ci inšyja skazy, — dyk chaj tyja ludzi nie zabywajucca, što nadrukawany twor — heta tolki ramki, u jakija nam treba pakłaści swoj źmiest. Inakš ihra budzie mała žywoju, jana nie zachopić nikoha, horš jašče — jana nie zacikawić samych artystaŭ i jany na druhi raz nia miecimuć takoje achwoty, kab pieramahčy tyja, biazumoŭna zaŭsiody prysutnyja zaminy ŭ ładžańni pradstaŭleńnia. Nia treba razumieć hetaha tak, što kožny artyst moža jeździć uzdoŭž i papiarok pa tekście pjesy, a razumieć treba tak, što forma mienš ważnaja čymsia źmiest i źmiest žywy, taki, jak my jaho pieražywajem. Samastojnaje myśleńnie ważniejšaje za ŭsio i jaho nam treba baranić na't pry ładžańni pradstaŭleńnia.

Treba pomnić, što šmat z taho, što dziady i baćki našyja pakidajuć u spadčynie ŭ formie wopratki, abyčyjaŭ, chatnich abradaŭ, pieśniaŭ, usieńka heta maje wialikaje značeńnie kulturalnaje. Treba šanawać swaju spadčynu kulturnuju. I woś miž inšym scena teatralnaja wielmi moža nam pamahčy, kab nie zahinuli wielmi charakternyja i bahatyja rysy z našaje minuŭščyny. Što heta moža šmat pamahčy, bačym chacia z taho, što niekatoryja wakolicy, dzie Lawonichu wiedali jašče z hutarak starych dziadulaŭ ci babulaŭ, moładź pačała tancawać bačučy wyklučna na scenie. Scena swaja pamoža da bolšaje ŭważnaści i dbajłaści ab našuju pieśniu, jakaja nia maje sabie roŭnaje pa charastwie, a jakoje my prosta nia ŭmiejem acanić, nia majem da jaje perspektywy, heta jak toj blizkazročny, što maje wočy i bačyć usieńka, kali bližej prysunie da wačej, a zdalok świet dziela jaho byccam nia isnuje. Tutaka pieśniu, naadwarot, treba adsunuć, krychu dalej pastawić jaje na scenu, a my samyja zachopimsia, čujučy, jak čaroŭnyja huki henyja, jak jany nam pamohuć — uspamin ab ich, u ciažkija časiny, kolki radaści nam daść.

Woźmiem wopratku, woźmiem pokazki wiaskowyja, nidzie nie zapisanyja, nikomu niewiadomyja. My ich pastawiŭšy na scenu apraniem u nowuju formu, u jakoj jany adžywuć i nabiaruć nowych koleraŭ.

Zrazumieła, što ničoha niama biaz pracy, što ŭsiudy treba natuhi. Tolki nidzie i nikoli niama jnakš. Čaławiek tolki tady čuje ŭ sabie radaść i achwotu da žyćcia, kali jon sam čuje, što jdzie, što sustrakaje adpor peŭny. Ludzi, jakija nia majuć hetaha, jakija lišnie „ščaśliwyja", chutka ŭ swajom ščaści abniadužywajucca i hublajuć usiakuju achwotu da taho, kab niešta rabić. Dyk i z teatram kłopatu i natuhi šmat, ale za toje kolki karyści, kolki charastwa, kolki nowych horyzontaŭ pierad dziejnym siabrom teatralnaha zhurtawańnia, pakidajučy ŭžo na staranie hramadzkuju staranu pytańnia teatralnaha.

Teatr, roŭna jak muzyka ci ahułam ŭsie mastackija prajawy žyćcia, nie źjaŭlajecca roskaššu, zusim naadwarot, u ich krynica šlachotnaści, u im žaralo postupu, maralnaści. Niekatoryja praŭdy nazaŭsiody astanucca čužymi i dalokimi, pakul abrazna čaławiek na ich nie pahlanie.

Складайцеся на адзіны ў Зах. Беларусі квартальны літаратурна - навуковы журнал „К а л о с ь с е". Складка на адну кніжку найменш 1 зл.— Кніжка 5-я „Калосься" (першая ў гэтым годзе) ўжо ў друку. — Прысылайце дзеля друку матэрыялы, адпаведныя характару журналу!

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:

Вільня, Завальная 1—2.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič